3. *Суховская, Д. Н.* Реализация творческого потенциала населения через креативные пространства города: лофты, зоны коворкинга, арт-территории [Текст] / Д. Н. Суховская // Молодой ученый. – 2013. – № 10. – С. 650–652.

# КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЯ АДУКАЦЫЯ Ў БЕЛАРУСІ: СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ

***А. І. Смолік,***
*доктар культуралогіі, прафесар,*
*загадчык кафедры культуралогіі*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Фарміраванне належнага прафесійнага майстэрства спецыяліста з'яўляецца важнейшай умовай эфектыўнага выканання сацыяльна-культурнымі інстытутамі сваіх грамадска значных функцый, асновы якіх вызначаны ў Канцэпцыі аптымізацыі зместу, структуры і аб'ёму сацыяльна-гуманітарных дысцыплін ва ўстановах вышэйшай адукацыі [12]. У сучасных умовах сістэма вышэйшай адукацыі, як падкрэсліў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Г. Лукашэнка, павінна хутка, мабільна, гнутка рэагаваць на змены ў грамадстве і патрабаванні часу. Адначасова адукацыя мусіць забяспечваць і сённяшнія патрэбы, адпавядаць тым задачам, тым пасадам, якія існуюць у сучаснай сацыякультурнай сітуацыі. Яна вымушана захоўваць адносную стабільнасць адукацыйнай структуры на доўгую перспектыву і быць гнуткай у вызначэнні аб'ёму інфармацыі, ведаў, уменняў, навыкаў і тэхналогій, якія забяспечваюць якаснае выкананне службовых абавязкаў [13].

Гэта, як нам падаецца, абумоўлена шырынёй, шматварыянтнасцю і поліаспектнасцю самога феномена культуры. Глыбокае і ўсебаковае асэнсаванне ролі культуры ў перыяд мадэрнізацыі беларускага грамадства сведчыць аб тым, што сацыяльна-культурная дзейнасць аб'ектыўна становіцца ўмовай удасканалення сацыяльнай рэчаіснасці, важнай формай самавыяўлення, самарэалізацыі асобы. Асэнсаванне ролі культуры як стратэгічнага рэсурсу дзяржавы выклікала неабходнасць культуралагічнай адукацыі не толькі ў гуманітарных ВНУ. На мяжы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

XX–XXI стст. культуралогія як вучэбная дысцыпліна ўведзена ў вучэбныя планы ўсіх вышэйшых навучальных устаноў, у многіх былі ўтвораны кафедры культуралогіі, адкрыты магістратура і аспірантура.

Адначасова ў вышэйшых навучальных установах культуры і мастацтва з’явіліся новыя культуралагічныя спецыяльнасці. Падставай для іх утварэння стала сацыяльна-культурная дзейнасць, накіраваная на забеспячэнне ўмоў для найбольш поўнага развіцця, самасцвярджэння і самарэалізацыі асобы праз засваенне духоўных каштоўнасцяў. Роля культуролага набыла асаблівую сацыяльную вагу ў сувязі з тым, што ў сацыяльна-культурнай сферы цэнтрам усеагульнага прыцягнення сталі малыя групы, камерныя формы пазнавальнай, культурна-творчай, рэкрэацыйнай дзейнасці. Уводзячы новыя спецыяльнасці, дзяржаўныя інстытуцыі зыходзілі з таго, што галоўнай задачай культуролага ёсць стварэнне ўмоў для найбольш поўнага развіцця і самаразвіцця, самасцвярджэння і самарэалізацыі розных катэгорый насельніцтва сродкамі культуры.

Аналіз узроўню прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў сацыяльна-культурнай сферы краіны паказаў, што дзейная сістэма адукацыі не зусім адпавядала патрабаванням часу, яе неабходна было ўдасканаліць. А калі ўлічыць, што падрыхтоўкай кадраў мастацтвазнаўчых і культуралагічных спецыяльнасцей займаліся толькі тры вышэйшыя і невялікая колькасць сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, то стане зразумелым: сацыяльна-культурная сфера была нездавальняюча забяспечана кадрамі.

Перад сацыяльнымі інстытутамі краіны востра паўстала праблема насычэння сацыякультурнай сферы прафесійна падрыхтаванымі кадрамі, якім давядзецца працаваць у спецыфічных умовах адкрытага мікрасацыяльнага асяроддзя.

У Канцэпцыі развіцця вышэйшай школы Рэспублікі Беларусь у новых умовах былі вызначаны два асноўныя накірункі падрыхтоўкі спецыялістаў для культурна-асветных устаноў: забеспячэнне галіны культуры, з аднаго боку, арганізатарамі аматарскай мастацкай творчасці, а з другога – арганізатарамі правядзення змястоўнага вольнага часу насельніцтва [12]. Сутнасць праблемы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі спецыя-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лістаў палягала ў пераадоленні яскрава выражаных супярэчнасцей паміж велізарнай колькасцю сацыяльна значных задач і некампетэнтнасцю многіх работнікаў у іх вырашэнні.

У працэсе рэформы вышэйшай школы, якая прыпала на 1990-я, беларускія ВНУ культуры і мастацтва імкнуліся пераадолець існуючыя супярэчнасці. Першым крокам на гэтым шляху было пераўтварэнне ранейшых інстытутаў ва ўніверсітэты і акадэміі, што дазволіла пачаць падрыхтоўку па шэрагу новых спецыяльнасцей. Так, у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў былі ўведзены новыя спецыяльнасці і спецыялізацыі, сярод іх – менеджмент сацыяльна-культурнай сферы, менеджмент міжкультурнай камунікацыі, педагогіка сацыякультурнай дзейнасці, рэжысура масавых відовішчаў і свят, народныя рамёствы, фальклорнае мастацтва, народная творчасць, рэжысура тэатральнай творчасці, сусветная і айчынная мастацкая культура, сацыяльна-псіхалагічная рэабілітацыя сродкамі мастацтва і інш. Новыя спецыялізацыі ўводзіліся ў Беларускай акадэміі музыкі і Беларускай акадэміі мастацтваў. Адначасова вышэйшыя навучальныя ўстановы актыўна займаліся абнаўленнем адукацыйных стандартаў, вучэбных планаў і праграм, якія вызначылі змест культуралагічнай і мастацкай адукацыі. Важна, што стандартамі ўстанаўліваліся патрабаванні да ўзроўню прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў, якія атрымлівалі культуралагічную і мастацкую адукацыю. Створаная мадэль вышэйшай прафесійнай адукацыі была зарыентавана як на сусветныя стандарты гуманітарнай адукацыі, так і на нацыянальна-культурныя асаблівасці развіцця Рэспублікі Беларусь.

Паралельна вялася інтэнсіўная праца па стварэнні вучэбна-метадычнай літаратуры па фундаментальнай і прыкладной культуралогіі. За першае дзесяцігоддзе XXI ст. айчынныя культуролагі распрацавалі і выдалі арыгінальныя вучэбныя дапаможнікі і манаграфіі (Ю. П. Бондар [1], Т. І. Глушакова [6], Я. Д. Грыгаровіч [2], І. В. Казакова [3], М. І. Крукоўскі [4], Л. К. Кухто [7; 8], І. В. Марозаў [11], У. Ф. Мартынаў [10], І. Я. Левяш [9], І. Я. Ыыршоў [5], В. Р. Языковіч [14] і інш.

Удасканаленню сістэмы бесперапыннай адукацыі спрыялі каледжы культуры і мастацтваў, якія існавалі пры БДУ куль-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

туры і мастацтваў (Мазырскі музычны і Магілёўскі бібліятэчны каледжы). У апошнія гады зроблены яшчэ адзін крок па ўдасканаленні сістэмы бесперапыннай адукацыі. З прычыны вострага недахопу кадраў ва ўстановах культуры і мастацтва на базе Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў былі створаны каледжы ў Гомелі, Брэсце, Віцебску, Гродне. У каледжах навучэнцы авалодвалі асноўнымі дысцыплінамі першага і другога курсаў вучэбнага плана ВНУ і пры паступленні ў вышэйшыя навучальныя ўстановы адразу залічваліся на трэці курс.

Важнейшай задачай сацыяльна-культурнай палітыкі стала стварэнне эфектыўнай сістэмы павышэння прафесійнага ўзроўню работнікаў культуры. Гэтая катэгорыя спецыялістаў, улічваючы творчы характар працы, яе шматфункцыянальнасць, зменлівасць формаў і зместу, больш чым іншыя мела патрэбу ў пастаянным узбагачэнні новымі ідэямі і перадавым вопытам. Дзеля ўзбагачэння найноўшымі ведамі і тэхналогіямі супрацоўнікаў устаноў культуры ў Рэспубліканскім інстытуце вышэйшай школы і БДУ культуры і мастацтваў пачалася перападрыхтоўка кадраў па спецыяльнасці «культуралогія» і павышэнне іх кваліфікацыі. У шэрагу беларускіх ВНУ вялося навучанне адоранай моладзі ў магістратуры, аспірантуры і дактарантуры па фундаментальнай і прыкладной культуралогіі. У БДУ культуры і мастацтваў, Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Я. Купалы былі створаны саветы па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый.

На мяжы XX–XXI стст. адбыліся першыя абароны кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый у Гродне і Мінску. На рынку працы з'явіўся новы спецыяліст. Рынак на новы інтэлектуальны прадукт адрэагаваў станоўча. Дактарам культуралогіі кіраўніцтва некаторых вышэйшых навучальных устаноў прапанавала ўзначаліць кафедры культуралогіі і іншых сацыяльна-гуманітарных дысцыплін (У. Ф. Мартынаў, А. А. Павільч, У. П. Скараходаў, А. І. Смолік), кандыдаты навук уліліся ў шэрагі дацэнтаў і нават прафесараў. Попыт на маладых вучоных быў і застаецца ў розных установах сацыякультурнай сферы. Так, намеснікам дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі па навуковай і выдавецкай дзейнасці стаў кандыдат

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуралогіі А. А. Суша, Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік шмат гадоў узначальвае кандыдат культуралогіі Т. А. Джумантаева, начальнікам аддзела навучальных устаноў Міністэрства культуры з’яўляецца кандыдат культуралогіі А. А. Каваленя, на пасадзе прарэктара па міжнародных сувязях РІВШ працуе кандыдат культуралогіі Л. С. Кажухоўская. Кандыдаты культуралогіі І. Л. Коган, С. К. Кахановіч, І. М. Шумская займаюцца навукова-даследчай дзейнасцю ў ЗША і Канадзе. Адным словам, на сённяшні дзень рынак далёка не запоўнены спецыялістамі вышэйшай кваліфікацыі ў галіне культуралогіі, ён нават пашыраецца. Расце цікавасць да беларускай культуралагічнай школы, якая сёлета адзначыла сваё дваццацігоддзе, у Кітаі. У бягучым акадэмічным годзе на кафедры культуралогіі навучаецца 6 кітайскіх аспірантаў і 21 магістрант, прычым 19 з іх – на англійскай мове.

Аналіз працаўладкавання выпускнікоў бакалаўрыяту і магістратуры па спецыяльнасці «прыкладная культуралогія» таксама сведчыць аб попыце на менеджараў сацыякультурнай дзейнасці і міжкультурнай камунікацыі з боку ўстаноў культуры і адукацыі. У 2020 г. першыя працоўныя месцы атрымалі 418 бакалаўраў-культуролагаў, большасць працуе ва ўстановах культуры. Якасцю іх прафесійнай падрыхтоўкі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў кіраўніцтва ўстаноў задаволена (97,5 %).

Такім чынам, за чвэрць стагоддзя ў Беларусі сфарміравалася шматгаліновая сістэма непарыўнай культуралагічнай і мастацкай адукацыі *з чатырма ўзроўнямі: пачатковым, сярэднім спецыяльным, вышэйшым і паслядыпломным.* Аналіз навукова-даследчай, педагагічнай і сацыякультурнай дзейнасці выпускнікоў дактарантуры, аспірантуры і выпускнікоў бакалаўрыяту і магістратуры ва ўстановах культуры паказвае, што здабыткі ў культуралагічнай школы ёсць. Яны, магчыма, былі б больш плённымі, калі б удалося пераадолець шэраг перашкод на шляху яе развіцця.

РЭПОЗІТОРИЙ БГУКИ

*1. Бондарь, Ю. П.* Культура как образование: теоретико-прикладной анализ : моногр. / Ю. П. Бондарь, А. И. Смолик ; М-во культуры Респ. Белорусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств ; науч. ред. П. И. Бондарь. – Минск : БГУКИ, 2015. – 301 с.

*2. Грыгаровіч, Я. Д.* Прыкладная культуралогія : вучэб. дапам. / Я. Д. Грыгаровіч, А. І. Смолік. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2005. – 228 с.

*3. Казакова, И. В.* История и теория культуры : учеб.-метод. пособие / И. В. Казакова (авт.-сост.). – Минск : Зорны Верасок, 2010. – 664 с.

*4. Крукоўскі, М. І.* Філасофія культуры : уводзіны ў тэарэтычную культуралогію : вучэб. дапам. / М. І. Крукоўскі. – Мінск : Універсітэцкае, 2000. – 192 с.

*5.* Культурология: теория и история культуры : учеб. пособие / И. Е. Ширшов [и др.] ; под общ. ред. И. Е. Ширшова. – Минск : БГЭУ, 2004. – 543 с.

*6.* Культурология: Эстетика : учеб.-метод. комплекс для студентов дневной и заочной формы обучения / Т. И. Глушакова [и др.]. – Минск : Изд-во МИУ, 2008. – 224 с.

*7. Кухто, Л. К.* Культуралогія : тэорыя культуры : вучэб. дапам. / Л. К. Кухто, А. І. Смолік. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 281 с.

*8. Кухто, Л. К.* Культуралогія : гісторыя культуры : вучэб. дапам. / Л. К. Кухто, А. І. Смолік, А. А. Цобкала – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 311 с.

*9. Левяш, И. Я.* Культурология : курс лекций / И. Я. Левяш. – Минск : ТетраСистемс, 2008. – 544 с.

*10. Мартынов, В. Ф.* Культурология. Теория культуры : учеб. пособие / В. Ф. Мартынов. – Минск : ТетраСистемс, 1998. – 336 с.

*11. Морозов, И.* Основы культурологии. Архетипы культуры / И. Морозов. – Минск : ТетраСистемс, 2001. – 608 с.

*12.* Об утверждении Концепции оптимизации содержания, структуры и объема социально-гуманитарных дисциплин в учреждениях высшего образования : приказ М-ва образования Респ. Беларусь, 21 марта 2012 г., № 194. – edu. Gov. by / main. Aspx.

*13.* Педагогический корпус страны – оплот стабильности, наш главный государственный ресурс : выступление Президента Республики Беларусь А. Г. Лукашенко на совещании педагогического актива // Информ. бюл. Администрации Президента Республики Беларусь. – 2011. – № 9. – С. 6–18.

*14. Языкович, В. Р.* Культурология : учеб.-метод. пособие / В. Р. Языкович. – Минск : РИВШ, 2010. – 364 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ